Медработніку даводзілася аказваць тэрміновую дапамогу не толькі партызанам свайго атрада, але і суседняга, які насіў імя 14 Слуцкіх партызан. Нават у баях ён заўсёды меў з сабой медыцынскае абсталяванне. Гэтага чалавека з удзячнасцю ўспамінаюць усе тыя, з кім звёў яго лёс на цяжкіх баявых дарогах. Дапамагаў гэты чалавек таксама і газеце.

«Я і зараз помню, як зайшоў у хату, асцярожна пастукаў у дзверы, якія ўпрыгожвала таблічка "Зубаўрачэбны кабінет", - пісаў М.Е. Дастанка. - Мяне прыветліва сустрэў малады высокі ў белым халаце чалавек. Гэта быў Леанід Васільевіч Самусевіч. Мне як рэдактару Слуцкай падпольнай газеты неабходна было пагутарыць з тымі, хто застаўся жывым пасля разгрому гітлераўцаў. Мы пазнаёміліся. Я расказаў яму, што выпускаю газету і лістоўкі. Прыемна было чуць словы падзякі за газеты, якіх, як адзначыў Леанід Васільевіч, чакалі днём і ноччу, якія дапамагалі дыхаць, улівалі жыццё ў нашы сэрцы» (Дастанка 197$, 12-13).

М.Е. Дастанка шмат рабіў, каб «Народны мсцівец» стаў змястоўным, цікавым выданнем, даваў сваім чытачам інфармацыю, здольную абудзіць лепшыя патрыятычныя пачуцці. Дзякуючы яму выданне стала рознабаковым, імкнулася ахапіць усе сферы тагачаснага жыцця, нягледзячы на скпаданыя ваенныя ўмовы. Газета друкавала не толькі палымяныя публіцыстычныя артыкулы-заклікі, але і пісала пра звычайных людзей, што кавалі перамогу над фашызмам 60 гадоў таму. Дзейнасць газеты Слуцкага райкома партыі «Народны мсцівец» - гэта толькі адна выдатная старонка з гісторыі больш чым 170 падпольных выданняў гадоў Вялікай Айчыннай вайны. Выданне выкарыстоўвала самыя розныя формы і метады падачы матэрыялаў. Партызанская газета - гэта яшчэ і крыніца дакументальнага і публіцыстычнага характару пра барацьбу патрыётаў Случчыны з гітлераўскімі захопнікамі. Палымянае і праўдзівае слова савецкіх публіцыстаў, няштатных аўтараў дазваляла распаўсюджваць інфармацыю пра падзеі на франтах у глыбокім тыле ворага, у акупіраваных раёнах, партызанскіх атрадах. Менавіта таму газета І заняла сваё пачэснае месца ў сістэме перыядычнага друку ваеннага часу.

ЛІ ТАРАТУРА

Астрэйка А. Слуцкі пояс. Вершы: 36. Слуцк, 1943.
Бельскі А. Асоба І творчасць А. Астрэйкі // Роднае слова. 1997. № 3. С. 8-9.
Дастанка М. Дапамога народа // Народны мсцівец. 1943. 13 чэрв.
Дастанка М.На Урэччы // Народны мсцівец. 1943. 3 чэрв.
Дастанка М. Партызанскі стаматолаг//Здравоохранение Белоруссии. 1979. № 7. С. 12-13.
Дастанка М. Слуцкія людзі // Народны мсцівец. 1944. 1 студз.
Дастанка М. Старонкі жывой гісторыі // Чырвоная змена. 1958. 5 мая. С. 3.
НА РБ. Ф. 4. Воп. 33а. Спр. 274. Л. 2.
НА РБ. Ф. 3968. Воп. 1. Спр. 2. Л. 11-55.
Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Слуцкага раёна І г. Слуцка: У 2 кн. Мн., 2000. Кн. 1.
Хасаін В. Задание выканалі // Народны мсцівец. 1943. 13 чэрв.

Паступіў у рэдакцыю 09.06.05.

*Наталля Анатольеўна Зубчонак* - кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры гісторыі журналістыкі і літаратуры факультэта журналістыкі.

*Н.Б. РАШЭТНІКАВА*

## ТЭМА ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ Ў ШКОЛЬНЫМ КУРСЕ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

Освещены концептуальные подходы к изучению военной прозы в курсе белорусской литературы; раскрывается система работы, направленная на формирование у школьников необходимых знаний и умений. Особенный акцент делается на решении проблемы нравственного воспитания молодежи.

The article covers the conceptual approaches to studying «war» prose in the course of Belarusian literature; the system of work aimed at formation of required for schoolchildren knowledge and skills has been revealed. Special emphasis is made on the problem of moral upbringing of youth.

Ваенная тэма - адна з асноўных у творчасці беларускіх пісьменнікаў другой паловы XX ст. і ў школьным курсе беларускай літаратуры, спецыфіка выкла-

дання якога ў старшых кпасах у тым, што ён падаецца на гістарычнай аснове, аглядавыя тэмы мяжуюцца з манаграфічнымі. Усё гэта дае магчымасць настаўніку разглядаць праблематыку і вобразную сістэму твораў на розных узроўнях, з рознай мерай падрабязнасці.

Патрыятычным пафасам прасякнуты творы пра вайну, што мае вялікае выхаваўчае значэнне. Подзвіг народа, найвышэйшы ўздым духоўнасці, праявы лепшых якасцей чалавека - усё гэта ўзор маральнасці для юнакоў і дзяўчат.

Для многіх выдатных мастакоў слова Беларусі Вялікая Айчынная вайна была тым часам, калі фарміраваўся светапогляд, загартоўвалася асоба. Былыя франтавікі М. Лынькоў, І. Шамякін, Я. Брыль, І. Навуменка і іншыя адлюстравалі перажытае ў мастацкай творчасці.

В. Быкаў вядомы ва ўсім свеце як пісьменнік ваеннай тэматыкі. У працэсе азнаямлення з ягонай творчасцю вучні абапіраюцца на веды, атрыманыя раней, што дапамагае ім асэнсоўваць ідэйна-мастацкі змест твораў у розных кантэкстах. Разгледзім асноўныя падыходы да вывучэння манаграфічнай тэмы ў старшых класах на канкрэтным прыкладзе. Так, у 11 класе ў межах тэмы «Васіль Быкаў» тэкстава вывучаецца аповесць «Знак бяды», аглядава - аповесці «Пакахай мяне, салдацік», «Ваўчыная яма», апавяданні «На Чорных лядах», «Жоўты пясочак», «Труба», «Народныя мсціўцы» (праграма з паглыбленым і профільным вывучэннем беларускай літаратуры).

На гэтым этапе літаратурнай адукацыі ў сярэдняй школе пажадана, каб вучні спасціглі ідэйна-мастацкі змест твораў, усвядомілі аўтарскую канцэпцыю свету, чалавека і вызначылі яе ў айчынным і сусветным кантэкстах.

Педагагічную канцэпцыю манаграфічнай тэмы «Васіль Быкаў» настаўнік вызначае сам, улічыўшы своеасаблівасць тэматыкі і праблематыкі, жанравую раз-J настайнасць, спецыфіку выяўлення аўтарскай пазіцыі ў асобных элементах твора. Ключом да асэнсавання прачытанага могуць служыць метафарычныя назвь кніг В. Быкава. Нагадаем некаторыя з іх: «Жураўліны крык», «Знак бяды» «Мёртвым не баліць» і інш. Аўтарскі светапогляд выяўляецца ўжо ў назвах аповесцей, раманаў, літаратурнай крытыкі, публіцыстыкі: «Праўдай адзінай» «На крыжах», «Крыжовы шлях» і г. д. В. Быкаў прыйшоў са сваёй тэмай, сваё£ праўдай пра вайну. Сітуацыі, у якія трапляюць героі пісьменніка, жорсткія, трагічныя, пазбаўленыя штучнага пафасу. В. Быкаў падкрэсліваў: «...мяне цікавяць у першую чаргу не сама вайна, не яе побыт, і не тэхналогія бою, хоць усё гэта для мастацтва таксама важна і цікава, але галоўным чынам унутраны свет чалавека, магчымасці яго духу» (Быкаў 1984, 66). Героі праходзяць праз выпрабаванні, робяць свой выбар у жорсткіх ваенных абставінах.

Нельга не пагадзіцца з І. Шаблоўскай, што «прастора і час ваеннай прозы заўсёды экстрэмальныя, набрынялыя катастрофай, гвалтоўнай смерцю, пакутамі. Вымушана ідэалізаваны, палітызаваны чалавек выведзены за рамкі нармальнага жыцця, намагаецца выжыць, выстаяць. Літаратура сваімі мастацш і сродкамі выпрабоўвае чалавека на здольнасць супрацьстаяць вайне не толы і фізічна, але адолець глупства тэхнакратычнай свядомасці і наогул адмовіцца аД вайны» (Шаблоўская 1993, 12). Экзістэнцыяльная паэтыка твораў В. Быкава вызначаецца аўтарскай канцэпцыяй свету, а «жыццё-смерць» - гэта не толыгі адзін з асноўных матываў ваеннай прозы, а дамінанта, якая адчуваецца на ўсіх узроўнях твора, такіх яго кампанентах, як сюжэт, канфлікт, сістэма характараў, моўныя сродкі. Жыццё-смерць (вайна) успрымаецца як метафара і галоўны кантэкст мастацкага твора (гл. Шаблоўская 1993, 19). Завостранасць праблематыкі твораў В. Быкава скіроўвае работу настаўніка-славесніка на выкарыстанне такх прадуктыўных прыёмаў і форм работы, як дыскусія, дыспут. Філасафічнасць, глыбокі псіхалагізм быкаўскіх аповесцей даюць магчымасць школьнікам выйсці за межы твора, паразважаць пра найважнейшыя праблемы чалавечага быццм, асэнсаваць прачытанае на новым узроўні. Якія ж гэта праблемы? ПералічыМ некаторыя з іх: час і лёс чалавека, грамадства і асоба, здрадніцтва і гераізм.

У аповесці «Знак бяды» (1982) сярод адной з цэнтральных з'яўляецца праблема калектывізацыі. Услед за І. Мележам В. Быкаў адлюстраваў трагедыю с-ляніна, які страціў зямлю, а значыць, аснову жыцця. Дзеянне разгортваецца ў двух планах: у перадваенны час і ў ваенны. Гвалтоўная калектывізацыя адмоў-

на адгукнулася ў перыяд, калі ўзнікла неабходнасць згуртаваць людзей у барацьбе з акупантамі. Галоўныя героі твора па-рознаму рэагуюць на калектывізацыю. Сцепаніда - напачатку аптымістычна, яна - актывістка ў камітэце беднаты, Пятрок з жахам думае пра наступствы раскулачвання, і аказваецца, ііито менавіта ён і мае рацыю. Метафарычная назва аповесці сугучна аўтарскай пазіцыі. Знак бяды ў творы ўсюды: гэта І маленькая птушка на чужым полі, І крыж, што спілавалі камсамольцы; невыпадкова І поле, якое арэ Пятрок, завецца Галгофай, месцам пакуты. І няма каму абараніць людзей. Паказальны эпізод, дзе Пятрок у Мінску спрабуе знайсці Чарвякова, каб той заступіўся за Лявона Багацьку. Даведаўшыся пра смерць кіраўніка рэспублікі, Пятрок адчуў разгубленасць і бездапаможнасць. «На асфальце падворка ахапіла такая гарачыня, што стала млосна, і ён раптам забыўся, куды павярнуць, каб ісці да вакзала. Глумны тупат напоўз на яго свядомасць, ён не мінаўся ўсю дарогу да станцыі, І як Пятрок стаяў у чарзе па білеты, І як пасля сядзеў пад сцяной на лаўцы, чакаючы цягніка на Оршу. Усё, што рабілася навокал, было яму дужа пастыла і дужа хацелася дамоў» (Быкаў 2001, 440). У аповесці гэта апошні ўспамін героя, які прыняў пакутніцкую смерць ад рук паліцаяў.

Трагізм падзей у перадваенны перыяд І трагедыя чалавека на вайне ў творы зліваюцца, ствараюць адзіную карціну цяжкага жыцця чалавека на такой дарагой ім зямлі. Маленькі хутар для Петрака - адзіны прытулак І выратаванне. Нікому героі твора не аддадуць сваю зямлю. Таму і гучыць сімвалічны фінал аповесці: «Пажар ніхто не тушыў, хутар гарэў грунтоўна і доўгіа - усю ноч, дагарэў у наступны дзень, і паліцаі не падпускалі нікога блізка, самі трымаючыся воддаль, - баяліся выбуху бомбы. А бомба на ўзгорку чакала свае пары» (Быкаў 2001, 450). Сцепаніда і Пятрок прымаюць пакутлівую, жахлівую смерць. І гэта таксама знак бяды. Але знак для тых, хто здрадзіў і дапамагаў акупантам, знак немцам, якія прыйшлі на чужую зямлю са зброяй. Сцепаніда разважае: «У каго праўда, таму не патрэбна зброя. Зноў жа даволі паглядзець, хто з імі ў хаўрусе, каб зразумець, хто яны самі. Да апошняй сваёй хвіліны яна не скорыцца ім, бо яна чалавек, а яны звяры. Хай сабе і дужыя» (Быкаў 2001, 443).

Праблема здрадніцтва - адна з галоўных у аповесці «Знак бяды». Па глыбіні філасофскага і псіхалагічнага зместу скпадана знайсці твор, які можна было б паставіць побач. У творы А. Адамовіча «Карнікі» раскрыты «механізм» здрадніцтва, і фактычна ў кожным творы пра вайну гэта праблема так ці інакш ставілася і вырашалася. В. Быкаў таксама неаднаразова звяртаўся да яе асэнсавання. Дастаткова прыгадаць аповесць «Сотнікаў», дзе героі апынуліся ў бязвыхаднай сітуацыі. У перастрэлцы паранілі Сотнікава, Рыбак не кінуў таварыша, і абодва трапілі ў рукі паліцаяў. Для Сотнікава палон скончыўся гераічнай смерцю, а Рыбак «прагматычна» здраджвае, супакойваючы сваё сумленне разважаннямі аб тым, што, калі застанецца жывым, зможа працягваць барацьбу з немцамі. Аднак усёй логікай развіцця падзей В. Быкаў пераканаўча паказвае, што той, хто аднойчы стаў на шлях здрадніцтва, назаўсёды згубіў магчымасць застацца і памерці чалавекам. Амаральнымі сродкамі нельга здзейсніць высокія мэты.

У аповесці «Знак бяды» паліцаі (здраднікі) выглядаюць больш небяспечнымі для насельніцтва, чым чужынцы. «Як жа так можна? - пытаўся ў думках Пятрок, - каб свае - сваіх? Гэта ж як спрадвеку шанавалі ў вёсцы добрыя адносіны паміж людзьмі, рэдка хто (можа, вырадак толькі) адважыўся на яўнае зло ў адносінах да суседа, даваў сабе волю судзіцца ці нават сварыцца з такім жа, як сам, селянінам» (Быкаў 2001, 384). І сапраўды, хто вінаваты ў тым, што свае забіваюць сваіх?

Які шлях да здрадніцтва прайшлі Зміцер Гуж, Патап Каландзёнак і Антось Недасека? Кожны з персанажаў - вынік мастацкага абагульнення і ўяўляе сабой вобраз-тып. Зміцер Гуж у нечым падобны да героя аповесці «Жураўліны крык» Пшанічнага (абодва з сям'і раскулачаных), і тым не менш яны істотна адрозніваюцца. В. Быкаў свядома адмовіўся ад схемы: кожны раскулачаны - вораг савецкай улады. Зміцер, напрыклад, родам з працавітай, сумленнай сям'і. «Бывала, падлеткам абтрасаў сады, глуміўся з меншых, пляжыў гародніну ў Выселках. Калі ў сучкі Карнілы завёўся сабачка, які не даваў Гужу разбойнічаць

паначы, дык той злавіў яго, удушыў і павесіў у Карнілы на слупе. Гэты літасці не меў ад роду. Не тое, што ягоны рупны, добры і гаспадарлівы старэйшы брат ці нават строгі, але спакойны, набожны бацька, які даводзіўся нейкай раднёй Петраку» (Быкаў 2001, 317). Жорсткія ад прыроды людзі сустракаюцца, але ж гэта хутчэй выключэнне. Іншая справа Патап Каландзёнак. Няма больш жорсткага і страшнага паліцая, чым былы «селькор». Васіль Быкаў не паглыбляецца ў біяграфію героя, а вылучае толькі асобныя моманты з яе. Каландзёнка ненавідзелі на вёсцы да вайны. Ненавідзелі і баяліся пасля таго, як Патап «выкрыў» старую Прахорыху, выцягнуўшы з-пад страхі «тры куксы выдатнага гладкага кужалю». Пра «кпасавую пільнасць» Каландзёнка напісала раённая газета, а сам Патап разам з маці перабраўся з лазні ў сельсавецкую хату. Нянавісць Каландзёнка да людзей мае пад сабой рэальную аснову: калісьці ў дзяцінстве Патап краў у аднавяскоўцаў вяндліну і інш., і за гэта яго калектыўна пакаралі Жаданне адпомсціць усім і кожнаму знішчыла ў ім усё чалавечае. Пятрок здзіўляецца: «Што ж гэта? Як жа гэта? Мы ж некалі з ягоным бацькам таварышавалі Разам у салдатах служылі. Бацька ж чалавек быў...» (Быкаў 2001, 352).

Антон Недасека ў нечым роднасны Рыбаку з «Сотнікава». Тыя ж беспрынцыповасць і імкненне выжыць любой цаной. Калі загадаюць, ён І брата павесіць Цікава, што брат у Антона ёсць. Гэта той, хто ў часы калектывізацыі адмовіўс: ад уласнага прозвішча і стаў Новікам. Новік жорстка праводзіць раскулачваннл, любой цаной імкнецца выканаць афіцыйныя дырэктывы і тым самым робіць кар'еру. Антось з той жа стараннасцю служыць гітлераўцам і радуе аднавяскоўцаў. Сцепаніда слухае Недасеку і думае: «Такія ад прыроды сляпыя да маленькага пробліску чалавечнасці, дбаюць толькі аб сабе і апраўдваюцца часам дзецьмі. Божа, што будзе яшчэ з тых іхніх дзяцей, што яны пераймуць ад гэтых во татцаў?» (Быкаў 2001, 368).

Аўтар паказаў, што разбурэнне ўкладу жыцця селяніна-гаспадара адмоўна ўздзейнічала на людзей, стварала атмасферу нянавісці. І на хвалі тэрору ўзнімаліся новыя «героі», якія ў час вайны сталі актыўна супрацоўнічаць з гітлераўцамі супраць сваіх жа аднавяскоўцаў. Глыбокі псіхалагізм у раскрыцці характару дзейных асоб, завостранасць канфлікту і трагічны гуманізм грунтуюцца на бязлітаснай і жорсткай праўдзе рэальнага жыцця, прадстаўленага пісьменнікам праз прызму свайго светаадчування.

Асэнсаванне ідэйна-мастацкага зместу творчасці В. Быкава патрабуе звароту да розных колаў кантэксту і спрыяе фарміраванню ў вучняў здольнасці да аналітызму і філасафічнасці.

Вывучэнне твораў В. Быкава ў старшых кпасах дае магчымасць настаўн ку адмовіцца ад аўтарытарных падыходаў у выкладанні літаратуры, прапанаваць школьнікам самастойна шукаць адказы на балючыя пытанні часу, выказваць уласныя меркаванні, спрачацца (завочна) з аўтарамі крытычных артыкулаў Г ствараць сваю ўласную інтэрпрэтацыю твораў выдатнага пісьменніка.

ЈІ ІТАРАТУ РА

Адамовіч А. Здалёк і зблізку. Мн., 1976.
Быкаў В. Балота. Знак бяды: Аповесці. Мн., 2001.
Быкаў В. Вялікая акадэмія-жыццё//Быкаў В. Праўдай адзінай. Мн., 1984.
Шаблоўская І. Паэтыка славянскай ваеннай прозы. Мн., 1993.

Паступіў у рэдакцыю 05.04.05.

*Ніна Барысаўна Рашэтнікава* - кандыдат педагагічных навук, дацэнт кафедры рыторыкі і Методыкі выкладання мовы і літаратуры.